«Вясна» — «экстрэмісцкае фармаванне».
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

За падпал "Табакеркі" ў Жодзіна - тры гады калоніі ўзмоцненага рэжыму

26.04.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Суд горада Жодзіна 26 красавіка вынес прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да Сяргея Лаўкайціса. Яго абвінавацілі ў здзяйсненні злачынства, прадугледжанага часткай 3 арт. 339 Крымінальнага кодэкса (хуліганства).

Справу разглядаў суддзя **Іван Грышкевіч**, дзяржабвінаваўца – памочнік пракурора **Дзмітрый Ярашэвіч.**

Згодна з прад'яўленым абвінавачваннем Лаўкайціс 5 снежня, у перыяд часу з 23.15 па 23.23 гадзін, знаходзячыся ў грамадскім месцы ў г. Жодзіна, з хуліганскіх меркаванняў здзейсніў наўмысныя дзеянні, якія суправаджаліся пашкоджаннем чужой маёмасці. Папярэдне падрыхтаваў не менш чым у 4 пластыкавых бутэльках лёгкаўзгаральную гаручую сумесь, якой наўмысна абліў з тыльнага боку гандлёвы кіёск "Табакерка" і падпаліў, у выніку чаго адбылося ўзгаранне, якая пашкодзіла маёмасць ЗАТ "Энэрга-ОІЛ".

Лаўкайціса затрымалі адразу ж, “Табакерку” патушылі.



Спаленая "Табакерка". Фота: СК РБ.

Тым самым быў нанесены матэрыяльны ўрон на агульную суму 341 рубель 12 капеек, што склала на момант здзяйснення злачынства 12,63 базавых велічынь.

Сваю віну сяргей Лаўкайціс прызнаў цалкам і раскайваецца ў здзейсненым.

Сёння дзяржабвінаваўца запрасіў для абвінавачваемага **тры гады пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.**

Адвакат заявіў, што гэтае злачынства стала вынікам аператыўнага эксперыменту і папрасіў даць пакаранне без рэальнага зняволення.

У судзе быў абвешчаны перапынак для прыняцця рашэння.

Суддзя Грышкевіч вынес прысуд: **тры гады пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.**

Опубликовать



Вясна. Правы чалавека ў ...
10 242 подписчики

Подписаться на Страницу

СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ



Эколага з Мядзеля судзяць за "неаднаразовае пікетаванне" і "дыскрэдытацыю Беларусі"

За пратэсты 2020 года ў Брэсце асудзілі яшчэ 6 чалавек

У Брэсце асудзілі ўжо 11-ю групу за "грубае парушэнне парадку" ў 2020 годзе

У Брэсце яшчэ 5 чалавек асудзілі за ўдзел у акцыі пратэсту 10 жніўня 2020-га

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Не менш за 15 чалавек выйшлі на волю па заканчэнні тэрмінаў у кастрычніку, адна з іх — жанчына

Палітвязня Аляксандра Арановіча будуць судзіць па новай крымінальнай справе. З ім няма сувязі амаль 5 месяцаў

Праваабарончая праграма "Вясна"

Дзмітрый Канеўскі: "Прэсінг у дачыненні да сябе ў калоніі я адчуваў штодня"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя перад выбарамі*2025. Першая справаздача кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары"

Больш за месяц невядомае месцазнаходжанне палітвязня Аляксандра Францкевіча

За чатыры гады ў Беларусі знішчаны незалежны прафсаюзны рух: 17 актывістаў дагэтуль за кратамі

Еўрадэпутаты запатрабавалі поўнага захавання правоў чалавека і стандартаў выбараў у Беларусі

Суды над "Ганаровымі грамадзянамі" Віцебшчыны і абнаўленне "экстрэмісцкага" спісу: хроніка пераследу 12-13 лістапада

За "перашкоду выбарам і рэферэндуму" з 2020 года ў Беларусі асудзілі 20 чалавек

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Кастрычнік 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2025

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

Московская Хельсинкская Группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde

VOICE OF BELARUS

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

